ТЭКСТ ДЛЯ ВОДГУКУ

***
Туркоча дзікі голуб на сасне,
І водгулле ў сухім палене.
Адсвяткаваць бы захапленне,
І хай усё благое нас міне!

Ўсё лес і лес. Далёка гул палёў,
Дарожны пыл, спяванне рэек.
Журботна і шчымліва неяк
Ад туркату нябачных галубоў.

Адчулася – як быццам бы адзін
Застаўся я на белым свеце,
Мяне забылі нават дзеці,
І я нічый ні друг, ні брат, ні сын.

Мільёны год да поля і шашы
Вы, продкі, йшлі,
і стогн птушыны
Біў, як і ў гэтую часіну…
Відаць, боль продкаў у маёй душы.

І ёсць віна, мой лес, перад табой:
За тое ж мёртвае палена,
За птушанё, што акалела,
За усе набегі браканьера
Плачу я сёння болем і журбой.

Туркоча дзікі голуб на сасне
Сваю элегію лясную.
Дамоў вярнуся, засумую,
І, можа, зноў пакліча лес мяне.

Аляксей Пысін
1972